УДК 398.3

*І.А. Швед*

# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ БЕЛАГА КОЛЕРУ Ў ПЕСЕННЫМ ФАЛЬКЛОРЫ БЕЛАРУСАЎ

У выніку функцыянальна-семантычнага і гісторыка-генетычнага аналізу вызначаюцца функцыянаванне і семантыка белага колеру ў песенным фальклоры беларусаў. Праз знакавасць белага колеру, які ў песенным фальклоры мае амбівалентную ацэнку, спасцігаюцца і апісваюцца ў адпаведнасці з пэўнымі жанравымі законамі тры асноўныя аб'екты, якія належаць свету «Рэчаіснасць»: сам чалавек (у тым ліку ў лімінальным стане); рэальны навакольны свет; значымыя часавыя адрэзкі. Белы колер выяўляе пазітыўныя эстэтычныя і эмацыянальныя ацэнкі лірычных герояў. Разам з тым ён сімвалічна карэлюе з ідэямі смерці, хваробы, тугі.

## Уводзіны

«Белы» з'яўляецца адным з самых частотных і семантычна нагружаных колеравых сімвалаў песеннага фальклору беларусаў. Пытанні сімволікі колераў закраналіся беларускімі фалькларыстамі ў сувязі з вывучэннем мастацкіх асаблівасцяў пэўных фальклорных відаў і жанраў (казак і загадак – працы К. Кабашнікава; песень і чарадзейных казак – У. Конана, А. Гурскага, А. Ліса; замоў – Т. Рабец, І. Еўтуховай; дэманалагічных аповедаў – У. Сівіцкага, Л. Леванцэвіч; фразеалогіі – У. Коваля, Т. Валодзінай і інш.). Нельга не адзначыць даследаванні А. Фядосіка, які, аналізуючы вясельную абраднасць і паэзію, указаў на важную ролю колеравых эпітэтаў, што выразна характарызуюць маладога (ружовы) і яго вопратку *(у яго панчошкі бялявыя, кашулька бяленькая)*. Славуты вучоны звярнуў увагу і на тое, што «асабліва часта прыгажосць нявесты падкрэсліваецца эпітэтам белая, радзей – румяная: «Бела млода, бела, бела», «Бела Ганначка, бела», «Бялей нет, бялей нет Ганны»; часам і таўталагічным эпітэтам: «Нявеста прыгожа, як бель бялюсенька… як бель бялёвана». І далей: «Рэзкім кантрастам вызначаюцца эпітэты ў велічальных песнях і сатырыка-гумарыстычных: у першых яны ўзвялічваюць, ідэалізуюць пэўных дзеючых асоб вяселля, у другіх – ганьбяць, высмейваюць: «Наша сванка маладзенькая, // Беленькая, ружовенькая…» [1, с. 236–238].

Аналізуючы беларускія песні-вяснянкі, А. Ліс звярнуў увагу на вобраз белых птушак, «цікавых, загадкавых»: «Ці гэта нейкія міфалагічныя прадстаўнікі арніталагічнага свету, якія мелі пэўны статус у выраі, ці найменне нашых звычайных буслоў у знакавай сістэме архаічных уяўленняў, уласцівых міфалагічнай свядомасці» [2, с. 204]. А. Гурскі, усебакова вывучыўшы беларускія лірычныя песні, адзначыў, што прыметнікі тыпу найбялейшы, ужытыя ў найвышэйшай ступені, перадаюць «пяшчоту, ласку, захапленне дзяўчыны да каханага, нястрыманае, усеперамагаючае, самаахвярнае любоўнае пачуццё» [3, с. 81]. Даследчык акцэнтуе ўвагу і на тым, што ў любоўных песнях накшталт «Адзін конік, як лебедзь бяленькі, // Другі конік… як голуб сівенькі. // Трэці конік, як воран чарненькі…» з мэтаю найбольшай мастацкай выразнасці для параўнання выкарыстаны вобразы з супрацьлеглымі якасцямі: лебедзь бяленькі – воран чарненькі. Эпітэты выражаюцца прыметнікамі ў памяншальна-ласкальнай форме [3, с. 54] (адзначым, што на белізну лебедзя як яго стэрэатыпны колер указваў яшчэ А. Афанасьеў). Між тым функцыянальнасць і сімвалічная семантыка белага колеру ў песенным фальклоры беларусаў не былі прадметам спецыяльнага даследавання. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне функцыянавання і семантыкі белага колеру ў песенным фальклоры беларусаў пры дапамозе функцыянальна-семантычнага і гісторыка-генетычнага метадаў.

Як «першаколер», белы функцыянуе ў надзвычай шырокім коле абрадаў «пераходу», рытуалізаваных дзеянняў, звязаных з пачаткам і заканчэннем пэўных працэсаў, з'яўляецца знакам пераходу з аднаго свету ў іншы, адсылае ў рытуалах да формул ініцыяцыі, выяўляе канцэпт навізны. А дакладней – абазначае нараджэнне новага і адначасова знікненне-растварэнне старога. Такой прыкметай белага колеру, як 'ясны, светлы, чысты', матываваныя выразы «белы свет» і «белы дзень», якія нярэдка звязаны з ідэяй пачатку. Паводле абрадавых песень, у прыватнасці агульных калядак, «беленькі свет» выступае знакам пачатку спявання рытуальных песень, услаўлення Нараджэння Хрыстова: «*– Няхай, сынку, пачакаем // Беленькага свету, // У той час будзе пара спяваць, // Што Бог нарадзіўся…*» [4, с. 122]. У шматлікіх тэкстах, у прыватнасці зімовых песнях на любоўную тэматыку, выраз «белы свет» мае значэнне 'раніца' [4, с. 94, 107].

У сувязі з сімвалізацыяй белым колерам ідэй пачатку, пераходу, навізны характэрна яго функцыянаванне як маркёра рытуальных прадметаў, якія ўжываліся ў каляндарнай і сямейнай абраднасці. Гэта знайшло праламленне ў адпаведнасці з пэўнымі жанравымі законамі ў абрадавых песнях. Так, практыка ў час першага веснавога арання зямлі браць у поле белае яйка адлюстравалася ў песнях тыпу *«Едзь жа, ваша, у чыста поле, // У чыста поле заарываць // З соллю, з хлебам, з белым яйцом, // З белым яйцом, з боскім слаўцом…»* [5, с. 192]. Белым абрусам пакрывалі святочны стол (да прыкладу, на Каляды, зажынкі, вяселле, радзіны і інш.). Таму вобраз пакрытага белым абрусам стала (часта з сакральна вызначанай драўніны – цісу, дубу) характэрны для абрадавых песень, у тым ліку вясельных (*«Там у майго тэсцейка п'юць і гудуць, // Там і мэнэ маладога даўно глядуць. // Тэсовыя столыкі панастылаў, // Залатыя кубачкі понастаўляў, // Тэсовыя столыкі бэленько, // Залатыя кубачкі поўненько»* (Мясяцічы, Пінскі р-н) [ФЭАБ]; *«Ой, будай, матэнька рыдная, // На столі тысовому, // На столі тысовому, // На образы белёному // Дорогі товар стуіт, // Дорогі товар стуіт. // Ой, не іх жа той товар, // То Іроччын каравай…»* (Вайская, Камянецкі р-н) [ФЭАБ]).

Паводле жніўных песень, белы абрус – адзін з важных элементаў убрання стала, за які сядзе сам Рай [6, с. 51]. У калядных песнях спяваецца, што на *«століку на цясовым, на скацерці на бялёвай»* размяшчаюцца важныя святочныя атрыбуты [4, с. 160], а белыя тканыя рэчы выступаюць рытуальным дарам каляднікам [4, с. 182]. Белыя прадметы выкарыстоўваліся і ў калядных гульнях моладзі. Да прыкладу, белую хустку дзяўчына сцяліла перад хлопцам, каб разам з ім стаць на яе каленямі і пацалавацца. Пры гэтым ім спявалі: «*А я свайму міленькаму // Платок белы пасцялю. // Каму слаць, каму слаць…*» [7, с. 60].

Рэчы белага колеру шырока ўжываліся падчас выканання радзінна-хрэсьбінных абрадаў. Практыка адорвання гасцей прадметамі з белага палатна (цэльнае палатно, ручнікі, хусткі, фартухі – архаічныя жаночыя грошы славянскай традыцыі (В. Седакова)) шырока адлюстравалася ў абрадавых песнях тыпу *«Бабулька-рыбулька, // Прыйдзі дзісь да мяне. // Да майго дзіцяці, // На ручкі прыняці. // Дам табе заплату // Падарак, як карту, // Тоненькі, бяленькі, // Тоненькі, бяленькі, // З бабулькай раўненькі»* [8, с. 260]. Пакуль гаспадыня рыхтавала наміткі, госці спявалі, што парадзіха «*за полажкам, а за белькім… намётку кроя…*» [8, с. 190]. У радзінных і іншых песнях белыя пярыны, футра з гарнастая з'яўляюцца знакам раскошы (падпіўшы кум кладзецца спаць «на лісах, на саболях, на белых гарнастаях» [8, с. 339]). Праз актуалізацыю традыцыйных вобразаў белай пасцелі і белай вопраткі ствараецца спагадлівы, добразычлівы ў адносінах да персанажаў настрой, задаецца святочны, шчыры, сардэчны тон песеннага апавядання: *«Наложым, куме, сарочку белу, // Вып'емо, куме, яшчэ ў нядзелю…»* [8, с. 197]; *«А на ложку, а на беленькім // Парадзінуха ляжыць…»* [8, с. 191].

Прадметы белага колеру (белыя ручнікі, палатно, посуд) – абавязковы атрыбут вясельных рытуалаў. У вясельных песнях маркіроўка прадметаў белым колерам можа

падкрэсліваць іх важнае абрадавае значэнне, выяўляць семантыку рытуальнай чысціні, пераходнасці. У вясельных песнях печка, якая сімвалічна звязваецца з нараджаючым жаночым улоннем, малюецца пабеленай, і гэта, натуральна, мае пазітыўнае асэнсаванне і звязана з трактоўкай белага колеру як знака чысціні. Калі вясельная дружына заходзіць у хату па маладую, спяваюць: *«У нашого свата // Светліца, не хата. // Печ яго побелёная, // Чэсць яго ўхвалёная»* (Амельянец, Камянецкі р-н) [ФЭАБ]. У канструкцыі вобразнага паралелізму пабеленая печка асацыюецца з гатовай да шлюбных абрадаў маладой: *«Наша печка побелёная, // Наша печка побелёная, // Молодая нарэджоная, // А котка с печы, // А котка с печы // Ды опарыў собе плечы»* (Харомск, Столінскі р-н) [ФЭАБ].

Шматлікія песні адлюстроўваюць этнаграфічныя факты выкарыстання белых прадметаў у вясельным абрадзе. Частотным вобразам вясельных песень, як і самога рытуалу, выступае белы ручнік. Так, калі маладыя выпраўляліся да вянчання, спяваліся песні: *«Манечка круга стала ходыт, // За собой ангела водыт. // Пэршого – батэнька свого, // Другого – матэньку свою. // Ідэ Манечка із венчальнічка, // Яе матэнька в ворот стоіт, // Слёзкамі ўмываецца, // Белым ручнічком выціраецца…»* (Амельянец, Камянецкі р-н) [ФЭАБ]; *«Вітэ конэйкы-воронці, // Чы довызэтэ княгыну… // Под тыі свічкы ясныі, // На тыі рушнычкы білыі»* (Гвозніца, Маларыцкі р-н) [ФЭАБ]. Акты адорвання нявестай удзельнікаў вясельнага абраду рэчамі белага колеру паэтычна прадстаўляюць шматлікія вясельныя песні. Пры гэтым белая хустка, якую дорыць нявеста жаніху, асацыюецца са шчаслівым сямейным жыццём: *«Выняла хусцінку, яму даравала: // – Ды бялым-бяленька. // Ды глядзі, Колечка, // Каб доля дабрэнька…»* [9, с. 68]. Між тым эпітэт «белы» ў адносінах да вопраткі пэўных персанажаў, а таксама прадзіва, тканіны, ручнікоў, абрусаў, хусцінак і г.д. можа не ўносіць у фальклорныя творы дадатковых сімвалічных адценняў, бо белізна названых прадметаў з’яўляецца натуральнай. Пастаянны эпітэт «белы» ў такіх выпадках можа толькі ўказваць на пазітыўную ацэнку пазначаных ім рэалій.

Белая вопратка – шырока прадстаўленая характарыстыка рытуальнага пераапранання. Адной з функцый такой вопраткі з’яўляецца абазначэнне далучанасці аб’екта пераапранання да свету «не-людзей» ці маркіроўка яго як лімінальнай істоты. Нездарма сувязь белага колеру з убраннем нявесты – лімінальнай істоты – характэрная для старажытных і сучасных еўрапейскіх звычаяў і абрадаў. У шматлікіх вясельных песнях белы – гэта колер знакавых элементаў касцюма нявесты і дэталяў, якія выяўляюць яе статус: *«Ой скажітэ Танечкынуй матцы, // Ныхай пуйдэ в новую комору, // Ныхай прынысэ білэ покрывало, // Ныхай покрые мою русую косойку»* (Гвозніца, Маларыцкі р-н) [ФЭАБ]. Паводле іншых песень, белая квецень «убяліла» галаву нявесце [7, с. 326]; нявеста чэша русыя косы і звяртаецца да іх: *«Більш вы служыты ны будытэ, // Под білы вэлен підытэ, // Под білы вэлен підытэ, // Под білы вэлен с хустынкою…»* (Рухча, Столінскі р-н) [ФЭАБ]. Асацыяцыя белай вопраткі, галаўнога ўбору з касцюмам нявесты прадстаўлена не толькі ў жанрах вясельнага фальклору, але і ў песнях пра каханне, новых баладах і інш. У абрадавых песнях, хоць і не рэгулярна, белы колер вопраткі жаніха вылучае яго сярод астатніх хлопцаў. Ён, паводле калядных карагодных і гульнёвых песень, *«сядзіць на куце ў белым кажусе»* [4, с. 467].

Эпітэт «белы» выкарыстоўваецца як у апісаннях асобных персанажаў рытуалу, так і ў групавых выявах, стварэнні калектыўных вобразаў (да прыкладу, *«А вы, неразвяначкі, тонкія, бяленькія, // Як бумага, святленькія!..»* [9, с. 224]; *«Пыджанішнічык беленькій, // Чаго ты такі смеленькій?»* [10, с. 274]). З белымі лебедзямі параўноўваюцца як самі маладыя (*«…Над цэрквою хмара, // Сподымецца пара: // Обое роўнюсенькі, // Як лебедзь белюсенькі»* (Амельянец, Камянецкі р-н) [ФЭАБ]), так і бацькі нявесты [7, с. 292–293].

Адным са сродкаў стварэння ідэалізаваных вобразаў каравайніц, падвышэння іх статусу да царскага з'яўляецца абмалёўка іх рук як белых (хоць, зразумела, у адносінах да вобраза рук эпітэт «белы» з'яўляецца пастаянным): *«Коровай нараджоны, // Хто цебе нарадзіў? // – Нарадзіла пані каралеўна // Да рукамі да беленькімі, // Да перснямі золоценькімі»* (Аздамічы, Столінскі р-н) [ФЭАБ]. Белыя рукі, паводле вясельных песень, мае і нявеста: *«...А моя дівчына да по хатоньцы ходыть, // Білы ручэнькі за головоньку ломыть...»* (Моладава, Іванаўскі р-н) [ФЭАБ]. «Бяленькімі рукамі» выкрадаюць нявесту ўдзельнікі вясельных рытуалаў: *«...Собі (імя) вкралы. // Кралы йіі ручэнькамы. // Прывызлы конэчынькамы, // Кралы білэнькымы, // Прывызлы воронэнькымы»* (Рухча, Столінскі р-н) [ФЭАБ].

Вобраз белых рук як знак прыгажосці і дагледжанасці дзяўчыны актуалізуецца ў песенных тэкстах іншых жанраў. У шчадроўках, радзінных [8, с. 203, 257] і іншых песнях праз выяву вобраза белых рук гаспадыні ідэалізуецца яна сама: *«...Нашыя нэнькі ручкі біленькі, // Кругом стола ходыть, // Варэнычкі робыть...»* (Амельянец, Камянецкі р-н) [ФЭАБ]. У баладзе «Дачка-птушка» праз актуалізацыю вобраза белых рук гераіні падкрэсліваецца трагізм сітуацыі, цяжкасць вяртання ператворанай дачкі-пташкі ў родную хату: *«Гаем ляцела – галлё ламала // Белымі рукамі, // Полем ляцела – поле крапіла // Горкімі слязамі»* [11, с. 128]. Прыведзены ўрывак балады цікавы яшчэ і тым, што белыя рукі прыпісваюцца арнітаморфнай істоце, што сведчыць пра незанчатковае ператварэнне гераіні ў птушку.

Калі ўжо гаворка зайшла пра эпітэт «белы» ў адносінах да паэтычнага вобраза рук, то адзначым, што гэтым эпітэтам у розных фальклорных жанрах часта характарызуецца і шэраг іншых частак чалавечага цела, а таксама яно само. Калі праз эпітэт «белы» не падкрэсліваецца бледнасць цела ці твару чалавека, то «белае цела» абазначае 'ідэальна здаровае цела'. Пазітыўнае значэнне маюць таксама вобразы белых ног (знак дзявочай і жаночай прыгажосці), як у песнях накшталт *«Дзеваньку ўзялі, ды што ж ёй далі, // Далі панчошкі на белы ножкі...»* [4, с. 239]. У іншай песні парадзіха просіць пасцяліць пад яе «белы ножкі прасціраддлачка» [8, с. 261]. Абрадавыя песенныя тэксты часта абыгрываюць матыў «дзіця кланяецца маці ў белыя ногі» (*«...Ой, як прыіхав под воротычко, схопывся, // Своюй матонькі до белых ножок склонывся»* (Вайская, Камянецкі р-н) [ФЭАБ]). У галашэннях таксама вобразы белых рук і ног выступаюць сродкамі ідэалізацыі персанажаў. У радзінных песнях зрэдку сустракаюцца надзеленыя пазітыўным значэннем вобразы белых шчок і пятак, да прыкладу, кума куму цалуе ў белыя шчокі, кума кума – у белыя пяткі.

Белыя рукі і ногі, а таксама шыя, твар і белае цела ўвогуле выступаюць частотнымі вобразамі традыцыйных балад [11, с. 234, 354, 442, 559]. У баладзе пра трох птушак, што аплакваюць смерць молайца, сітуацыя дачаснай смерці героя перадаецца праз выяву цела белага, якое ляжыць каля крыніцы [11, с. 171]. Паводле балады пра бедную сястру, якую не шануюць браты, гераіня ў адчаі заклікае драпежнікаў разарваць яе «цела бела» [4, с. 98]. Паводле новых балад, белы твар з'яўляецца ідэалам прыгажосці як жанчыны, так і мужчыны (*«...Лычко біло, сам красівы, // Кудры в'юцца в тры рады»* (Мікіцк, Драгічынскі р-н) [ФЭАБ]). У шэрагу песень белы (бледны) твар – знак узрушанасці, глыбокіх перажыванняў лірычнага героя.

Асабліва выразна моцныя эмоцыі перадаюцца праз выяву змены колераў з чырвонага на белы: *«Прывызлы Марусю, ста-ла ў порозы, // Побыліло лычко, показалыс слёзы»* (Моладава, Іванаўскі р-н) [ФЭАБ]. Паводле песні пра дзяўчыну, якую казак схіліў да інтымных зносін, *«лажылас дівчына, ек з розы цвыточок, // Устала дівчына, ек білый платочок»* (Тышкавічы, Іванаўскі р-н) [ФЭАБ]. Белы колер у такіх кантэкстах атрымлівае адмоўнае ацэначнае значэнне. Прычынамі страты тварам белізны, паводле

песень, могуць з'яўляцца п'янства-пагулянкі, знаходжанне на сонцы і ветры, а часцей за ўсё – цяжкае жыццё маладой замужніцы.

Яшчэ адно назіранне тычыцца даволі рэгулярнага выкарыстання спалучэння (паводле тэрміналогіі Е. Бартміньскага – эквіваленцыі) белага і чырвонага колераў пры стварэнні партрэтаў хлопца і дзяўчыны, што ўказвае на блізкасць сімволікі гэтых колераабазначэнняў ('прыгожы', 'малады', 'здаровы'). Названыя персанажы могуць намініравацца як белыя і/ці чырвоныя, да прыкладу: *«Ах ты, беленькі малойчык, // Хто табе русы кудзеркі расчасаў?»* [4, с. 341]; *«Ой на горэ два дуба, // Ободва зеляненькі, // Маруся да Іванко // Обоі чырвоненькі...»* (Лышчыцы, Брэсцкі р-н) [ФЭАБ]. Ідэальная дзяўчына, нявеста, паводле песень, гэта тая, што «бела беліць, чыста ходзіць». І гэта адзін з «паказчыкаў» прыемнага дзявочага жыцця, іншым словамі, маркёраў дзявочасці. У велічальных калядках дзяўчыне, у вясельных песнях сваты маладога ўдзячныя *«молодусы за тонкія абрусы. // Тонко прала, звонко ткала // І белэнько былыла // Да нас нагрудыла»* (Боркі, Пінскі р-н) [ФЭАБ]. І наадварот, немагчымасць адмыцца-адбяліцца перадае ў песенных жанрах трагізм сітуацыі і асэнсоўваецца негатыўна. У ліку прыкладаў адзначым песню пра бедную, а таму нежаданую для брата сястру-госцю. Нават умыванне калінай (якая павінна перадаць гаротніцы сваю прыгажосць) не беліць жанчыну: *«Калінкаю ўмывалася... // Калінка мая не беліць мяне»* [4, с. 100]. Новае гучанне ў прыпеўках набывае традыцыйная апазіцыя «белае (чыстае) – нячыстае (бруднае)», да прыкладу: *«Семёнаўна, // Да есця разная, // Кашуля белая, // А сама гразная»* (Рубель, Столінскі р-н) [ФЭАБ].

Падкрэслім, што белы колер, які асацыюецца з рытуальнай чысцінёй, можа надзяляцца адваротным значэннем нечысціні, «нячэснасці» нявесты і проціпастаўляцца пры гэтым чырвонаму колеру як знаку цнатлівасці. Гэта пацвярджаецца творамі песенных жанраў розных славянскіх традыцый.

Паводле міфалагічных уяўленняў, прыкмета «белы» далучае прадстаўнікоў жывёльнага свету да асаблівага «міфалагічнага класа», дыстанцыюе іх ад жывёл «звычайнай» афарбоўкі, указвае на адхіленне ад нормы, ператвараецца ў своеасаблівы ярлык жывёл – цароў над сваімі родзічамі. Пэўнае праламленне гэтыя ўяўленні знаходзяць у песенных жанрах. Паводле каляндарна-абрадавых песень, на белых конях ездзяць св. Юр'я, Каляда і інш. У зімовых песнях колеравымі характарыстыкамі коней, на якіх едуць у чалавечы свет сакральныя госці, з'яўляюцца элементы трыяды «чорны – белы – сівы», пры гэтым *«Васілле едзіць на белым кані»* [4, с. 229–230]. У вясельных песнях на белым кані малюецца жаніх, белым колерам могуць маркіравацца капыты незвычайнага каня, выяўленага праз касмаграфічны код [4, с. 227]. Пэўную вылучанасць з шэрагу іншых істот набываюць птушкі белага колеру ў вяснянках, паводле якіх менавіта такія птушкі знаходзяцца ў выраі. У калядцы хлопцу спяваецца пра дзіўнага белага птаха, якога герой бачыць у акно і які выконвае функцыю сувязнога паміж двума прадстаўнікамі розных саслоўяў (і этнасаў) [4, с. 342].

Функцыя носьбітаў прыкметы «белы» замацоўвалася за пэўнымі рэаліямі: снегам, дымам, малаком, смятанай, сырам, яйкам, бярозай, мукой, капустай, ільном, лебедзем і да т.п. Іх вызначальны (стэрэатыпны) колер непасрэдна называецца ў песенным матэрыяле, да прыкладу: *«Наша молодая, // Як уюн ўецца, // Ваш молоды // Ны повырнэцца. // Наша молодая // Як сыр білы. // Ваш молоды // Як пынёк горілы»* (Рухча, Столінскі р-н) [ФЭАБ]. У песнях белым колерам можа характарызавацца ежа (у тым ліку рытуальная), хатняе начынне, падарункі і інш. Так, актуалізуюцца стэрэатыпныя колеравыя характарыстыкі цукру [10, с. 293]; пірага [8, с. 405]; каравая [6, с. 191]; сыру (*«І сваночка молодая, дай нам коровая, // Бэлюсенького сыра і зэлёного віна»* (Зубачы, Бярозаўскі р-н) [ФЭАБ]; малака (*«Сербіяночку гуляць – // Трэба сало поядаць, // А по белом молоку // Еле ногі волоку»* (Дрэбск Лунінецкага р-на) [ФЭАБ]). У шматлікіх песен-

ных творах эпітэт «белы» выкарыстоўваецца з мэтай ідэалізацыі артэфактаў, якія ён характарызуе. У валачобных песнях спяваецца пра белы шацёр, у якім сам Бог сядзіць, у калядных – пра *«белы намет, а в том намету славный панічу»* (Лышчыцы, Брэсцкі р-н) [ФЭАБ;]. Паволе балады, у белым шатры каралевіч сніць дзіўны прарочы сон [11, с. 559]. А ў вясельнай песні нявеста «садзіць, пасадзіць сваіх дзевачак на белых лаўках» [6, с. 191].

Варта адзначыць, што як у песнях даволі старажытных, так і пазнейшага паходжання часта выкарыстоўваецца міжжанравы архаічны сімвал белага каменя, які захоўвае функцыю маркіроўкі месца выканання значных для соцыума ці асобнага чалавека дзей. Так, для калядак характэрны традыцыйны матыў белага каменя, на якім знаходзіцца змяя-памочніца, што абяцае хлопцу ўдалы шлюб [4, с. 311]. Што да твораў больш позняга паходжання, то ўступам песень з матывам «муж вядзе тапіць жонку» з’яўляецца карціна выцякання рэчкі з-пад белага каменя: *«Із-пад каменю, із-пад белага // Цячэ рэчанька, рэчка быстрая, // А ў той рэчкі дзеўка мылася, // Яна мылася, вымывалася…»* (Роўбіцк, Пружанскі р-н) [ФЭАБ]. Традыцыйныя балады, якія ўтрымліваюць у сваёй структуры архаічныя загадкі, актуалізуюць вобраз белага каменя, які «без кораня расцець» [11, с. 670]. Белы камень у песенных тэкстах можа надзяляцца забаранняльнай і адмежавальнай функцыямі, як у вясельных сірочых песнях з матывам трох замкоў: «белы камень, жоўты пясок, сажань дашок» (*«Твоя маты злякаласа, // Под тры замкы схаваласа: // Пэршы замок – білы камынь…»* (Тышкавічы, Іванаўскі р-н) [ФЭАБ]).

У галашэннях і баладах выяўляецца традыцыйная сімвалічная сувязь рэалій белага колеру са смерцю. У галашэннях памерлага пяшчотна называюць белым лебедзем ці сокалам. У баладах пры дапамозе вобразаў белай хусткі і жоўтага пяску ствараецца карціна смерці молайца. Рэакцыяй дзяўчыны на вестку пра тое, што яе мілага забілі на вайне, з’яўляюцца словы: *«Калі б я была пташкой, // Слетала б до его, // Все косточкі собрала б // У беленькі платок. // І целечко зарыла б // У жоўценькі песок»* (Рубель, Столінскі р-н) [ФЭАБ]. У баладзе з матывам «смерць – памочніца мужа» малюецца вобраз нябожчыцы, накрытай белым палатном, што адлюстроўвае этнаграфічную рэальнасць [11, с. 601]. У баладзе з матывам прарочага сну жонка, якая нарадзіла сына, а сама памерла, «ляжыць у белі» [11, с. 543]. Гэтая балада цікавая яшчэ і тым, што ў ёй падкрэсліваецца, што сам нябожчык ляжыць у белым (варыянт – у чырвоным) адзенні, а ўдзельнікі пахавальнага абраду маюць жалобную вопратку чорнага колеру.

У традыцыйных баладах з матывамі метамарфозы чалавека ў расліну яе часткі нярэдка характарызуюцца белым і жоўтым колерамі. Так, тапеліца Ціхоня зарастае жоўтымі краскамі і зацвітае белым цветам [11, с. 389–390]. У іншай баладзе з матывам патаплення-ахвяравання дзяўчыны, з цела якой узнікаюць прыродна-ландшафтныя аб’екты, бела бяроза паўстае з твару тапеліцы [11, с. 411]. Вобраз белага дрэва (ліпы) абыгрываецца і ў баладным матыве пасадкі/вырастання дрэў на магілах закаханых [11, с. 477]. Белым колерам могуць пазначацца і іншыя аб’екты, якія ўзніклі ў выніку метамарфозы чалавека, у прыватнасці камень [11, с. 444].

Новыя балады, рамансы захоўваюць «смяротную» сімволіку белага адзення. У прыватнасці, у шырокавядомым рамансе пра самагубства дзяўчыны з-за здрады каханага самазабойца вяртаецца ў гэты свет у белай сукенцы (Малеч, Бярозаўскі р-н) [ФЭАБ]. Вобраз белай пасцелі ў новых баладах намнога часцей у параўнанні з традыцыйнымі баладамі і лірычнымі песнямі мае негатыўную аксіялагізацыю. Паводле адной з новых балад, пакінутая любым дзяўчына ляжыць у адзіноце ў бальніцы на белай пасцелі (Фядоры, Столінскі р-н) [ФЭАБ]. У іншай баладзе хлопец з-за таго, што бацькі не дазваляюць яму ажаніцца з любай, паміраў і *«свою любимую девчонку // К белой постельке призывал…»* (Вулька Сіманавіцкая, Драгічынскі р-н) [ФЭАБ]. Адмоўнымі канатацыямі надзяляецца вобраз белай падлогі, як у песні пра цяжкі лёс салдата: *«За лісом сонцэ воссіяло, // Там чорны ворон воскречал. // Шчаслівы той жэ быў мальчішка, //*

*Которы ў войску нэ буваў... // Ляжу на білому полу, // Черная мать не пожалее, // Не скаже: “Встань, сын, постелю”»* (Лышча, Пінскі р-н) [ФЭАБ]. Эфект узмацнення экспрэсіі дасягаецца ў прыведзеным тэксце за кошт абыгрывання кантрасных колеравых сімвалаў – белага і чорнага, якія ў дадзеным выпадку маюць агульнае адмоўнае значэнне.

**Заключэнне**

Функцыя носьбітаў прыкметы «белы» замацаваная за пэўнымі песеннымі вобразамі: снегам, малаком, сырам, бярозай, ліпай, мукой, лебедзем, глінай, паперай і інш. Функцыянаванне і семантыка белага колеру ў песенным фальклоры цесна звязаныя з этнаграфічнай рэальнасцю, фонавымі ведамі традыцыі і разам з тым вызначаюцца сітуатыўнасцю, «перацяканнем» сэнсаў. Праз сімволіку белага колеру ў песенным фальклоры спасцігаюцца і апісваюцца ў адпаведнасці з пэўнымі жанравымі законамі тры асноўныя аб’екты, якія належаць свету «Рэчаіснасць»: 1) сам чалавек, 2) рэальны навакольны свет (прастора і рэаліі, якія яе запаўняюць; прыродныя з’явы), 3) значымыя часавыя адрэзкі. Акрамя таго, праз актуалізацыю сімволікі белага колеру, уключанага міфапаэтычнай свядомасцю ў цыкл касмасацыяльных пераходаў, могуць мадэлявацца ўяўленні пра лімінальных істот (у прыватнасці, белы – знакавы колер элементаў адзення нявесты і жаніха), жывёл-медыятараў (сувязных паміж рознымі фрагментамі светабудовы, «сваім» і «чужым» светам).

У абрадавых песнях белы колер уваходзіць у сістэму сімвалаў, праз якія транслююцца асноўныя ідэі і мэты рытуалаў: дэкларацыя пераходу ў новыя сацыяльны і біялагічны станы, набыццё новага статусу, пакрыццё пэўнага дэфіцыту, прадуцыраванне дабрабыту, трансляцыя інфармацыі пра псіхафізічны, сацыяльны, матэрыяльны станы ўдзельнікаў рытуалу, выяўленне эстэтычных, эмацыянальных і іншых ацэнак. Пазітыўна ацэнены белы колер асацыюецца са святлом, чысцінёй, жыццёвай сілай, вытворчай патэнцыяй, якая знаходзіцца ў яйку, малацэ і мужчынскім семені, і суадносіцца з кардынальнымі канцэптамі пачатку (што выразна выяўлена ў ініцыяцыйных, прадуцыравальных і ачышчальных рытуалах). Гэта знайшло праламленне ў песенных тэкстах, у якіх актуалізуецца станоўчае значэнне рэалій белага колеру, звязаных з першымі членамі апазіцый здаровы – нездаровы, чысты – нячысты, прыгожы – непрыгожы, багаты – бедны, новы – стары, святочны – будзённы, высокі – нізкі (сацыяльны статус), добрая – нядобрая (доля). Часта пры дапамозе эпітэта «белы» акцэнтуецца ўвага на частках цела, што пераважна мае станоўчае значэнне. Разам з тым на міфалагічным узроўні беламу колеру можа надавацца семантыка пустаты, безжыццёвасці, бесцялеснасці, што адсылае да канцэптаў «смерць» і «нецнатлівасць» (у вясельным абрадзе і звязаных з ім песнях). Адсюль негатыўная семантыка песенных вобразаў, маркіраваных белым колерам, іх сімвалічная сувязь з ідэямі разлукі, тугі, хваробы, смерці.

СКАРАЧЭННІ

ФЭАБ – Фальклорна-этнаграфічны архіў кафедры беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Фядосік, А.С. Функцыянальнасць і семантыка абрадаў, жанравыя і мастацкія своеасаблівасці паэзіі асноўных этапаў вяселля / А.С. Фядосік // Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка : у 6 кн. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Кн. 2. – С. 107–272.

2. Ліс, А.С. Магічная семантыка абраду «Гуканне вясны». Песні-вяснянкі / А.С. Ліс // Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка : у 6 кн. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Кн. 1: Каляндарна-абрадавая паэзія. – С. 188–210.

3. Гурскі, А.І. Тайны народнай песні / А.І. Гурскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – 160 с.

4. Зімовыя песні: калядкі і шчадроўкі / уклад. А.І. Гурскага, З.Я. Мажэйкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 736 с.

5. Паэзія беларускага земляробчага календара / уклад. А.С. Ліса, падр. народ. календара У.А. Васілевіча. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 612 с.

6. Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / уклад. В.І. Скідана, А.М. Хрушчовай. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 342 с.

7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / А.М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2008. – Т. 4: Брэсцкае Палессе : у 2 кн. – Кн. 1. – 559 с.

8. Радзіны. Абрад. Песні / уклад. Г.А. Пятроўскай, апіс. абрадаў Т.І. Кухаронак. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 637 с.

9. Палескае вяселле / уклад. і рэд. В.А. Захаравай. – Мінск : Універсітэцкае, 1984. – 303 с.

10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. Б Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – 797 с.

11. Балады : у 2 кн. / уклад. Л.М. Салавей, Т.А. Дубкова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977–1978. – Кн. 1: Балады. – 1977. – 782 с.

***Shved I.A.* The Functions of White Colour in Folk Songs of Byelorusians**

The author of the article analyzes the functions and semantic of white colour in folk songs of Byelorusians. Through the polysemantic symbol of white color in the folk songs describes in accordance with certain laws of genre three main objects belonging to the world of «Reality»: the person (in particular liminalbeings), the real world around, significant time periods. White colour identification of the positive aesthetic and emotional assessments of the lyric hero. Also through the actualization of white symbols, included in the mythopoetic consciousness in space and social cycle transitions can be modeled by the submission of the dead, illness, anguish.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 21.10.2012